УДК 94(438):37.014.3«199»

**Л.А. Сукава,**
*аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі РІВШ*

# РЭФАРМАВАННЕ ШКОЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ ПОЛЬШЧА Ў 1990-я гг.

Цікавасць да гэтай тэмы грунтуецца на магчымасці вывучэння асноўных этапаў, тэндэнцый і асаблівасцей правядзення рэформ у школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Польшча пасля 1989 г. Гэта ўяўляе для нас інтарэс, бо дае магчымасць параўнання тых рэформ, якія праводзяцца, іх вынікаў у падобных умовах постсавецкай рэчаіснасці з нашым найбліжэйшым суседам. Гэта дазволіць больш аб'ектыўна ацэньваць рэформы ў сістэме нашай школьнай гістарычнай адукацыі, дазволіць убачыць яе станоўчыя бакі і недахопы. Адукацыйная рэформа Польшчы, якая ажыццяўляецца з канца 1980-х гг., адлюстроўвае ў цэлым тэндэнцыі, агульныя для пераходнага перыяду ўсіх постсацыялістычных краін, хоць і мае шэраг уласных адметных рыс.

*Мэтай артыкула* – выяўленне асноўных кірункаў рэформ у школьнай гістарычнай адукацыі і тых змен, якія мелі месца падчас іх правядзення. Варта адзначыць і тое, што гэта тэма практычна не вывучана ў рускамоўнай гістарыяграфіі, у адрозненне ад польскай. У Польшчы дадзеная тэма прыцягнула ўвагу шэрагу даследчыкаў. Адзначым самага вядомага з іх – Я. Мацярніцкага, які з'яўляецца аўтарам найбольш буйных і фундаментальных прац, прысвечаных як розным перыядам гістарычнай польскай адукацыі, так і розным аспектам. Дадзеная праблематыка даследавалася і такімі спецыялістамі, як В. Мэджэцкі, С. Казлоўска, Л. Макжэцкі, Ц. Маерэк, А. Зелецкі, Е. Цянткоўскі, Е. Тапольскі, Е. Мазур і інш. Пры напісанні артыкула ў якасці першакрыніц былі выкарыстаны пастановы аб рэформах, вучэбныя праграмы па гісторыі і школьныя падручнікі.

Да канца 1980-х гг. у Польшчы пачаліся радыкальныя перамены ва ўсіх сферах жыцця грамадства, у тым ліку і ў адукацыі. У гэты час перамены не абыйшлі бокам і школьную гістарычную адукацыю, якой заўсёды адводзілася асаблівае месца сярод школьных прадметаў. Асновы рэфармавання школьнай адукацыі былі закладзены яшчэ ў 1980-я гг. са з'яўленнем Салідарнасці, але пасля змены палітычнага курсу і адыходу ў 1989 г. ад сацыялістычнага шляху развіцця змены ў сістэме адукацыі набралі абароты.

Палітычныя перамены 1989 г. абудзілі сярод дыдактыкаў і настаўнікаў гісторыі вялікія надзеі. Яны чакалі, што новая польская гістарычная адукацыя будзе свабоднай ад ідэалогіі і палітычных тэндэнцый. Разлічвалі на поўную аўтаномію настаўніка, вялікую самастойнасць вучня ў працэсе вывучэння гісторыі, а таксама забеспячэнне школ лепшымі падручнікамі і сучаснымі дыдактычнымі сродкамі. Многія марылі аб павышэнне статусу прадмета гісторыі ў школе, гэта значыць аб павелічэнні колькасці гадзін, якія адводзяцца на дысцыпліну [6, с. 169]. Частка тых чаканняў не рэалізавалася, некаторыя толькі збольшага, але змены, якія адбыліся ў польскай гістарычнай адукацыі пасля 1989 г., былі вельмі плённымі.

У 1990 г. у экстранным парадку праводзяцца пераўтварэнні, сутнасць якіх заключалася ў далейшым адыходзе ад старых праграм і выключэнне з іх неактуальнага зместу, які насіў на сабе след ідэалогіі і палітыкі папярэдняга перыяду. У новай праграме 1990 г. для агульнаадукацыйных ліцэяў пазнавальныя і навучальныя мэты па сваёй значнасці былі пастаўлены на адзін узровень. У змесце гістарычных матэрыялаў галоўны акцэнт сталі рабіць на гісторыі Польшчы, якая выкладалася ў цеснай узаемасувязі з сусветнай гісторыяй [4, с. 162–163].

Настаўнік атрымаў свабоду ў рашэнні асобных праблем. Стваральнікі праграм падахвочвалі яго да індывідуалізацыі працэсу навучання, неабходнасці лічыцца з інтарэсамі і пазнавальнымі здольнасцямі вучняў. Гэтыя рашэнні грунтаваліся на дыдактычных прынцыпах, сфармуляваных яшчэ ў другой палове 1980-х гг.

У праграмах карэнным чынам была перагледжана найноўшая гісторыя. Не адмаўляючы недахопы ІІ Рэчы Паспалітай, асноўная ўвага стала надавацца яе дасягненням. Занялі годнае месца на старонках польскай гісторыі такія яе эпізоды, як дзейнасць польскага ўрада ў эміграцыі, дзеянні польскіх узброеных фарміраванняў на ўсходзе краіны, у тым ліку Арміі Краёвай у акупаваным рэгіёне. Стала крытычна падавацца гісторыя СССР, а таксама польска-савецкія адносіны. У выкладзе гісторыі на першы план выступалі залежнасць Польшчы ад СССР, палітычныя праследаванні, эканамічныя няўдачы, пастаянны палітычны крызіс, дзейнасць Касцёла і апазіцыі [13]. Менавіта гэтым падзеям найноўшай гісторыі надавалася асаблівая ўвага ў праграмах для базавай і сярэдняй школы, якія выйшлі ў 1992 г. і атрымалі назву «Праграмы мінімум». Асаблівасцю гэтых праграм было тое,

Рэпазіторый БДПУ

што ў іх даваліся толькі агульныя тэмы. Настаўнікі маглі па сваім меркаванні, у залежнасці ад свайго стылю выкладання або іншых асаблівасцей навучальнага працэсу, звяртаць увагу на значнасць той або іншай тэмы.

Важнай праблемай пачатку 1990-х гг. быў недахоп падручнікаў, якія падыходзілі б для новых умоў і адпавядалі патрэбам і чаканням. У першыя гады III Рэчы Паспалітай моладзь у асноўным выкарыстоўвала перапрацаваныя і адаптаваныя да новай праграмы падручнікі. У базавай школе гэта кнігі такіх аўтараў, як Е. Цянткоўскі, А. Сыты, М. Качэрскі, М. Косман; у ліцэях – Е. Тазбірава, Х. Манікоўская, Е. Ляшчынскі, А. Галоса. Дзейнічалі і старыя падручнікі для тэхнікумаў і прафшкол. Змены, якія праводзіліся ў адносінах да падручнікаў, датычыліся ў асноўным зместу і ў меншай ступені іх дыдактычнай формы. Аднак дастаткова хутка пачалі з'яўляцца новыя распрацоўкі. У 1990 г. А. Шчэшняк апублікаваў свой падручнік для 3 класа ліцэя, а А. Панковіч для 4 класа ліцэя. На год пазней выйшла з друку 1-е выданне падручніка Т. Цагельскага і К. Зялінскай для 2 класа ліцэя. З'явіліся і першыя новыя распрацоўкі для базавай школы (падручнік Т. Глубінскага (1992), Е. і Е. Цянткоўскіх (1993) і інш. Настаўнік змог зрабіць выбар з некалькіх падручнікаў для кожнага класа [1, с. 101].

Калі гаварыць аб сярэдняй школе, то ў 1993–1994 гг. «Школьнае і педагагічнае выдавецтва» выпусціла дзве раўназначныя серыі падручнікаў для агульнаадукацыйных ліцэяў. Адну распрацавалі Е. Тазбірава і калектыў аўтараў, а другую – К. Зялінска, С. Казлоўска і Р. Тусевіч. Інтэнсіўная дзейнасць у гэтым кірунку падтрымлівалася і іншымі выдавецтвамі: ПРІ (падручнік А. Радзівіла і В. Рашкоўскага), выдавецтва «Граф-Пункт» (падручнік С. Сярпоўскага, які ахапіў 1918–1994 гг.). Колькасць распрацовак гэтага тыпу паступова расла, але іх дыдактычны ўзровень вельмі адрозніваўся і не заўсёды быў дастаткова высокім. Новыя падручнікі, як правіла, з'яўляліся вельмі паспешна, аўтары і выдавецтвы імкнуліся апярэдзіць канкурэнтаў, што не садзейнічала ўдасканаленню іх дыдактычнага боку [1, с. 103]. Некаторыя з аўтараў імкнуліся ўзбагаціць свае падручнікі перадавымі дыдактычнымі распрацоўкамі, надаць ім у вачах вучняў прывабнасць.

У 1996 г. Міністэрства зацвердзіла новую праграму навучання гісторыі для базавых школ і ліцэяў. Яна замацавала тыя змены, якія праводзіліся раней у першай палове 1990-х гг. З'явілася і некалькі новых аўтарскіх праграм, распрацаваных з дапамогай настаўнікаў па гісторыі, а таксама некалькі новых падручнікаў гісторыі, прызначаных для моладзі, якая працягвае адукацыю ў «старой» базавай школе (падручнік Е. і Е. Цянткоўскіх і Е. Осіцы для 8 класа) і агульнаадукацыйнага ліцэя (падручнік А. Гарліцкага «Гісторыя 1939–1996/97 гг. Польшча і свет») [7, с. 39–40].

У 1990-я гг. акрамя падручнікаў пачалі актыўна распрацоўваць і выдаваць разнастайныя дыдактычныя матэрыялы ў дапамогу настаўнікам і вучням, якія не проста палягчалі працэс вывучэння гісторыі, але і рабілі яго значна цікавейшым, стымулюючы ў навучэнцаў цікавасць да прадмета. У гэты час з'явіліся новыя зборнікі тэкстаў дакументаў, сшыткі практыкаванняў і метадалагічныя распрацоўкі для настаўнікаў. Таксама было апублікавана шмат новых гістарычных карт і атласаў, дыдактычныя фільмы. Тэарэтычна настаўнік атрымаў значна багацейшы набор дыдактычных сродкаў, чым той, які быў у яго распараджэнні ў папярэднія гады.

На жаль, дрэннае фінансаванне польскай школы было прычынай таго, што ўсё гэта трапляла ў рукі настаўнікаў і вучняў у абмежаваным аб'ёме. Абсталяванне шматлікіх школ дыдактычнымі сродкамі не толькі не палепшылася, але і пагоршылася [12, с. 92]. Акрамя таго, гісторыя пачала губляць сваё ранейшае месца асноўнага прадмета ў адукацыйнай сістэме. Больш за ўсё гэта адлюстравалася на гістарычнай адукацыі моладзі, якая навучалася ў прафшколах і тэхнікумах, зрэшты як і ў базавых школах і ліцэях, хоць і ў меншай ступені. Нягледзячы на відавочнае паніжэнне цікавасці да прадмета гісторыі, яго пазіцыя сярод іншых прадметаў усё яшчэ была важкая. У базавых школах у канцы 1990-х гг. на яе прыходзілася 9 гадзін у тыдзень, у ліцэі, у залежнасці ад профілю, – ад 6–8 да 12 гадзін у тыдзень. Здараліся і адступленні ад гэтых норм, часцей не на карысць гісторыі. Так, у тэхнікумах і прафшколах час, што адводзіцца на гісторыю, у значнай ступені рэгуляваўся самімі навучальнымі ўстановамі, якія часта, пачынаючы з 1992 г., зразалі колькасць гадзін па гісторыі. Здаралася і так, што прафшколы адводзілі на вывучэнне гісторыі 1–2 гадзіны ў тыдзень на ўвесь цыкл навучання, а тэхнікумы 3–4 гадзіны ў тыдзень [2, с. 153–154].

Да сярэдзіны 1990-х гг. пачалі выяўляцца і іншыя недахопы ў рэфармаванні. Толькі часткова апраўдаліся чаканні на вялікую аб'ектыўнасць школьнай гісторыі. Крокі ў гэтай галіне ў большасці выпадкаў датычыліся старажытнай гісторыі. Паводле з агучанымі раней нормамі ў выкладанні сусветнай гісторыі, большая ўвага сталі надавацца цывілізацыйнай гісторыі. У выкладанні польскай гісторыі вярнулі на сваё месца гісторыю ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай, гісторыю шляхты і Касцёла. Годнае месца заняла культура, а таксама гісторыя яўрэяў і іх роля ў гісторыі Польшчы. У той жа час не

Рэпазіторый БДПУ

атрымалася зрабіць аб'ектыўнай найноўшую гісторыю. Школьныя падручнікі, прысвечаныя гэтай тэматыцы, не былі свабоднымі ад розных ідэалагічных і палітычных сімпатый і антыпатый. Нярэдка аўтары самі падбіралі факты, давалі асабістую іх інтэрпрэтацыю і ацэнку [7, с. 41–42]. Малы адрэзак часу з перажытай гісторыяй па прычыне таго, што яшчэ жыве пакаленне людзей, сведкаў тых падзей, у большасці выпадкаў давала больш або менш аднабаковы аналіз.

1990-я гг. не прынеслі прынцыповага пералому і ў тых метадах выкладання гісторыі, якія ўжываюцца на практыцы. Тым не менш, і тут можна выявіць нямала станоўчых з'яў. Быў зроблены далейшы крок у кірунку развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў. Гэтаму ў вялікай ступені спрыяла выкарыстанне зборнікаў тэкстаў дакументаў. Укараненне ў навучальны працэс такіх новых метадаў навучання, як «дэбаты», «мазгавы штурм», «дрэва рашэнняў», «аналіз сітуацыі», «драма». Актыўна-рэфлексіўная мадэль навучання знаходзіла ўвесь большую колькасць прыхільнікаў, але не змагла выціснуць пасіўна-сузіральную, якая і ў далейшым захоўвала ў школе дамінуючую пазіцыю, бо большасць настаўнікаў па-ранейшаму прытрымлівалася традыцыйных метадаў [2, с. 157].

Паралельна з правядзеннем апісаных вышэй змен у «старой» школе (8-гадовая базавая школа, 4-гадовы ліцэй, тэхнікум і прафшкола) пачалася праца над канцэпцыяй выкладання гісторыі ў новай, рэфармаванай польскай школе (6-гадовая пачатковая школа, 3-гадовая гімназія, 3-гадовы профільны ліцэй і прафшкола). Першапачатковай мэтай стала распрацоўка Базавай праграмы па прадмеце. Меркавалася, што ў ёй будзе сфармуляваны адзіны базавы змест, а больш канкрэтныя, аўтарскія праграмы стварацъ самі настаўнікі або ўзнікшыя па сваёй ініцыятыве калектывы аўтараў. Прадугледжвалася маштабнае скарачэнне факталагічнага матэрыялу з пераносам акцэнтаў на развіццё ўменняў вучняў. Працу над Базавымі праграмамі па гісторыі даручалі, аднак, часта людзям выпадковым, якія мелі дастаткова цьмянае ўяўленне аб новых тэндэнцыях у гістарыяграфіі і гістарычнай дыдактыцы. Усё гэта слаба спрыяла дабраякаснасці прац, як і праграм, якія ўвесь час змяняліся. Не гаворачы ўжо аб тым, што яны адмаўляліся ад супрацоўніцтва з найбольш кваліфікаванымі прадстаўнікамі ў галіне гісторыі і дыдактыкі. Не праводзілася таксама ніякіх падрыхтоўчых прац па вывучэнні і параўнальным даследаванні праграм па гісторыі ў іншых краінах [8, с. 280–281]. Усё гэта стала прычынай таго, што канчатковыя вынікі працы камісіі на базе МНА спарадзілі шмат спрэчак. У ліпені 1997 г. Міністэрства апублікавала вельмі абагульненую (на погляд некаторых спецыялістаў, у прынцыпе павярхоўную), базавую праграму для новай школы. У першым варыянце праграмы гісторыя апынулася практычна выключанай з праграмы агульнашкольнага навучання ў 1–3 класах. Для 4–6 класаў прадугледжвалася гісторыя як прапедэўтычны курс у рамках інтэграванага прадмета «Гісторыя і грамадства» (як яго назвалі пазней). Гісторыю як сістэматычную навуку планавалася выкладаць у 7–8 класах базавай і ў 1–2 класах сярэдняй школы. У старшых класах сярэдняй школы, якія рыхтуюць моладзь да вучобы ў ВНУ, прадугледжвалася пашыранае выкладанне па прадмеце. Такі план школьнай гістарычнай адукацыі сутыкнуўся з усеагульнай крытыкай. Да ўвагі былі прыняты толькі асобныя крытычныя заўвагі, галоўным чынам аб неабходнасці акцэнтаваць увагу на тых каштоўнасцях, якія фарміруе гісторыя (асабліва ў сярэдняй школе), а таксама гісторыю культуры [10, с. 36–40].

Увосень 1998 г. з'явілася новая палепшаная версія Базавай праграмы гісторыі. Прадугледжвалася, што ў базавай школе (4–6 класы) яна будзе вывучацца нараўне з дысцыплінай аб грамадстве, у рамках інтэграванага прадмета «Гісторыя і грамадства». Але і гэта версія праграмы доўга не пратрымалася. Канчатковы варыянт Міністэрства прыняло ў 1999 г. Распараджэннем міністра ад 15 лютага 1999 г. была прынята праграма, дзе абгрунтоўваліся мэты, змест і арганізацыя гістарычнага навучання ў новай базавай школе і гімназіях [14].

У адпаведнасці з гэтай праграмай, у новай базавай школе гісторыя перастала быць асобным прадметам. Было прынята рашэнне, што ў 4–6 класах яна будзе выкладацца ў рамках курса «Гісторыя і грамадства». Фактычна гісторыя была пераведзена ў разрад менш важнага раздзела курсу, падпарадкаванага ведам аб грамадстве. Згодна з «літарай» праграмы, гістарычны змест павінен быў падпарадкоўвацца грамадазнаўчаму зместу. Праўда шматлікія ўкладальнікі аўтарскіх праграм і школьных падручнікаў, напісаных для новай рэфармаванай школы, не вельмі прытрымваліся новаўвядзенняў і там, дзе толькі было магчыма, імкнуліся групаваць блокамі гістарычны змест, а таксама размяшчалі яго, абапіраючыся на прынцып храналогіі. Органы ўлады не пярэчылі гэтай практыцы, паколькі гэта была дакладная карэкціроўка памылковых пастулатаў Базавай праграмы. Такім чынам, на практыцы на інтэграваны курс адводзілі каля 8 гадзін у тыдзень (у 4–6 класах), з іх на гісторыю 3–4 гадзіны, у залежнасці ад профілю школы. У «старой» школе, у 4–6 класах на выкладанне гісторыі адводзілі 5 гадзін у тыдзень, такім чынам, гэта на гадзіну або нават 2 у тыдзень больш [5, с. 22–25].

Рэпазіторый БДПУ

Паводле распараджэння міністра, з лютага 1999 г. гісторыя як сістэматычная навука ўводзілася ў 3-гадовай гімназіі (аб'ём – 6 гадзін у тыдзень). У базавай праграме для гімназій рабіўся націск на сусветную гісторыю. Па меркаванні некаторых спецыялістаў, гэта магло прывесці да таго, што выпускнікі такой школы не будуць ведаць айчынную гісторыю ў належным аб'ёме. У гэтай сувязі шматлікія аўтары праграм і падручнікаў для гімназій імкнуліся па магчымасці пашырыць тэмы, якія асвятлялі гісторыю Польшчы. Гэта не заўсёды адпавядала прапісанаму ў Базавай праграме, але ва ўзнікшых умовах было, на іх погляд, цалкам абгрунтавана [9, с. 15–18].

Базавая праграма па гісторыі для 3-гадовага профільнага ліцэя была распрацавана толькі ў 2000 г. Нягледзячы на гэта і яна сутыкнулася з недаверам з боку спецыялістаў. Яе аўтары адводзілі на курс гісторыі ў ліцэі мінімум 6 гадзін у тыдзень (на ўвесь цыкл навучання). Але больш за ўсё трывог выклікалі намеры прыбраць гісторыю з навучальных планаў прафесійных школ. Як лічаць многія навукоўцы, падобныя захады рэальна пагражаюць паніжэнню ўзроўню грамадскай і грамадзянскай самасвядомасці будучых працоўных. Крытыка гэтых планаў была падтрымана і на XVI з'ездзе гісторыкаў Польшчы ў Вроцлаве яшчэ ў 1999 г. [2, с. 157]. Вышэйвыкладзеныя факты сведчаць аб тым, што пазіцыі гісторыі ў «новай» школе сталі слабейшыя, чым былі ў «старой». Узровень гістарычнай адукацыі пачаў падаць яшчэ ў «старой» школе, хоць адразу і нязначна, але з канца 1990-х гг. дадзены працэс стаў набіраць абароты.

У канчатковым варыянце Базавыя праграмы для новай базавай школы і гімназій былі хутка распрацаваны. Апублікавана было больш за дзясятак аўтарскіх праграм, рэалізацыя якіх пачалася на кожным узроўні адукацыі. Неўзабаве таксама была пачата і публікацыя падручнікаў па гісторыі для новай базавай школы і гімназій. І толькі за 2 першыя гады іх было выпушчана некалькі дзясяткаў. Дзякуючы гэтаму зараз настаўнік мае на выбар некалькі, а часам нават некалькі дзясяткаў падручнікаў, прызначаных для аднаго класа. Іх узровень вельмі розны і не заўсёды дастаткова высокі. Большасць публікуемых падручнікаў маюць прывабны для вучняў графічны выгляд, а некаторыя – яшчэ і багатую дыдактычную структуру. Але ж першыя праграмы, як і падручнікі, ствараліся ў паскораным тэмпе. Такім чынам, можна меркаваць аб тым, што не ўсе з іх прайшлі праверку часам, хоць канкурэнцыя ў гэтай галіне стымулюе аўтараў і выдаўцоў да далейшага ўдасканалення як зместу, так і дыдактычнай формы сваіх распрацовак [3, с. 17–21]. Разам з падручнікамі для новай школы выпусцілі шэраг новых зборнікаў гістарычных дакументаў, атласаў і карт. Фактычна адзіным недахопам у забеспячэнні школ найноўшымі дыдактычнымі матэрыяламі была адсутнасць фінансавых сродкаў, неабходных для іх набыцця.

Такім чынам, пры разглядзе адзначанага дзесяцігоддзя, на працягу якога ішло рэфармаванне школьнай гістарычнай адукацыі ў Польшчы, мы можам назіраць, што ў гэтым працэсе былі як станоўчыя, так і адмоўныя рысы. Так, сярод недахопаў, нараўне з адсутнасцю фінансавання і інш., можна вылучыць галоўны, звязаны з цалкам абгрунтаванай боязцю спецыялістаў з нагоды павелічэння тэмпаў паніжэння ўзроўню гістарычнай адукацыі ў школах. Да пераваг рэформы можна аднесці наданне настаўнікам большай свабоды ў сферы дыдактыкі. Акрамя таго, пачаўся працэс зрушэння асноўнага акцэнту ў школьнай гістарычнай адукацыі з эрудыцыі вучня, на авалоданне ім уменнямі самастойна атрымліваць інфармацыю і веды. Станоўчым вынікам можна назваць эвалюцыю зместу гістарычнай адукацыі, у якой больш увагі сталі надаваць гісторыі культуры і цывілізацыі.

*Літаратура і крыніцы*

1. *Burda, B.* Miejsce I rola programow autorskich w tworzeniu nowoczesnego podrecznika historii / B. Burda // Wiadomosci Historyczne. – 1994. – № 2. – S. 100–104.
2. *Kozlowska Z.* Reforma szkolna (uwagi historyka) / Z. Kozlowska // Wiadomosci Historyczne. – 2002. – № 3. – S. 152–158.
3. *Kozlowska Z.* Podstawa programowa historii w opinii komisji dydaktycznej zarzadu glownego polskiego towarzystwa historycznego / Z. Kozlowska // Wiadomosci Historyczne. – 1999. – № 4. – S. 13–33.
4. *Maternicki, J.* Edukacja historyczna Polakow w ostatnim piecdziesieoleciu (zaryz problematyki badawczej) J. Maternicki // Wiadomosci Historyczne. – 1995. – № 3. – S. 152–163.
5. *Maternicki, J.* Nieudana podstawa programowa historii / J. Maternicki // Wiadomosci Historyczne. – 1999. – № 4. – S. 13–33.
6. *Maternicki, J.* Szkolna edukacja historyczna w Polsce w latach 1939–2000 (szkiz syntetyczny) / J. Maternicki // Wiadomosci Historyczne. – 2002. – № 3. – S. 159–171.
7. *Mazur, J.* Podreczniki historii w szkole podstawowej – reczywistosc i oczekiwania / J. Mazur // Wiadomosci Historyczne. – 1997. – № 1. – S. 38–43.
8. *Medrzecki, W.* O podstawie programowej nauczania historii / W. Medrzecki // Wiadomosci Historyczne. – 1999. – № 4. – S. 279–282.
9. Podstawa programowa ksztalcenia ogolnego dla szkol podstawowych i gimnazjow // Wiadomosci Historyczne. – 1999. – № 1. – S. 13–33.
10. Podstawy programowe obowiazkowych przedmiotow ogolnoksztacacych. Zalacznik do zarzadzenia № 8 Ministra Edukacji Narodowej z dnia 15 maja 1997 r. Dz. Urz. MEN Nr 5 poz. 23 // Wiadomosci Historyczne. – 1998. – № 2. – S. 36–40.
11. Program nauczania historii dla gimnazjum (Program alternatywny) // Wiadomosci Historyczne. – 1999. – № 5. – S. 269–288.
12. *Topolski, J.* Edukacja historyczna. Stan aktualny. Oczekiwania. Perspektywy / J. Topolski // Wiadomosci Historyczne. – 1997. – № 2. – S. 92–93.
13. Ustawa z dnia 7 wrzesnia 1991 r. o systemie oswiaty // Dziennik Ustaw Nr 95 poz. 425. – Режим доступа: <http://www.men.gov.pl/index.php?option=com_content&view=category&layout> - Дата доступа 08.09.2010.

Рэпазіторый БДПУ

14. Ustawa z dnia 8 stycznia 1999 r. Przepisy wprowadzajace reforme ustroju szkolnego // Kancelaria Sejmu. – Режим доступа: <http://www.men.gov.pl/index.php?option=com_content&view=category&layout> - Дата доступа 23.09.2010.

*Summary*

*Scholastic historical education in Poland is considered in this article during the reformation period which covers 1989–1999. Those period can be characterized by a newly chosen way of development called democracy. A number of alterations, including historical education, were implemented to bring education to the European standards. The article zeroed in on such important vital aspects as creating new curriculum and textbooks, revising the content of historical scholastic course, eliminating gaps in polish and world history on pages of school textbooks, identifying the place of historical education in modern polish school.*

Паступіў у рэдакцыю 15.12.2010 г.

*УДК 94(476):336.71«1861/1914»*

***К.А. Бруханчык,***
*кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

# ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.)

Праблема вылучэння этапаў развіцця банкаўскай сістэмы Беларусі ў парэформенны перыяд, як і сама гісторыя крэдытна-фінансавай сферы рэгіёна, засталіся практычна за межамі вывучэння савецкай і сучаснай гістарыяграфіі. Маецца толькі некалькі прац, аўтары якіх прапаноўваюць свой падзел гісторыі крэдытных устаноў.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі банкаўскай сістэмы Расійскай імперыі адсутнічаюць звесткі аб перыядах дзейнасці розных крэдытных устаноў. Першыя працы дарэвалюцыйных гісторыкаў былі звернуты на даследаванне арганізацыі Дзяржбанка і яго аддзяленняў (В. Судзейкін, Я.І. Пячэрын, І.І. Левін).

Такая ж тэндэнцыя назіралася і ў савецкай гістарыяграфіі, прадстаўнікі якой павярхоўна згадвалі аб дзейнасці асобных відаў крэдытных устаноў, не надаючы ўвагі даследаванню банкаўскай сістэмы ў цэлым, этапам яе развіцця ў прыватнасці (В.В. Цімашэнка, М.Ф. Болбас, З.Е. Абезгаўз, І.Ф. Гдндзін, Л.М. Міхневіч).

У сучаснай гістарыяграфіі на сённяшні дзень маецца дастатковая колькасць навуковых, вучэбна-метадычных і публіцыстычных матэрыялаў, аўтары якіх падрабязна разглядаюць гісторыю станаўлення ўстаноў дробнага і буйнога крэдыту, ліхвярства, сацыяльна-эканамічных перадумоў іх узнікнення і асаблівасцей дзейнасці. Аднак этапы развіцця банкаўскай сістэмы Беларусі па-ранейшаму застаюцца за межамі вывучэння большасці сучасных навукоўцаў.

Выключэннем з'яўляецца беларускі гісторык Ю.Л. Грузіцкі, які першым прапанаваў вылучыць два этапы развіцця капіталістычнага крэдыту Расійскай імперыі, у тым ліку і беларускіх губерняў: 1860–1890 гг. – перыяд пераважна прамысловага капіталізму, 1890-я–1917 г. – перыяд сцвярджэння манаполій [4, с. 50]. Дадзены падзел даволі агульны. Ён не паказвае асаблівасці эканамічнага развіцця Беларусі і не дазваляе больш поўна ахарактарызаваць дзейнасць яе крэдытна-фінансавых устаноў. Разам з тым, прапанаваная класіфікацыя характэрна для цэнтральных расійскіх губерняў, дзе назіралася канцэнтрацыя вытворчасці, а не для беларускіх, у якіх не было такой значнай колькасці буйных прадпрыемстваў і банкаўскіх груп.

У выніку развіцця прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, будаўніцтва чыгунак і пашырэння гандлёвых аперацый былі створаны ўмовы для фарміравання новай крэдытнай сістэмы. З прычыны асаблівасцей развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі, геаграфічнага становішча беларуска-літоўскіх губерняў значнае распаўсюджванне атрымала дзейнасць аддзяленняў Дзяржаўнага банка, філіялаў расійскіх і замежных камерцыйных банкаў, устаноў дробнага крэдыту, невялікіх банкаў, заснаваных на мясцовым капітале, банкірскіх кантор і дамоў, якія займаліся ў асноўным улікам вэксаляў.

Да адкрыцця камерцыйных банкаў у заходніх губернях іх функцыю выконвалі гандлёвыя фірмы, якія сумяшчалі камерцыйныя аперацыі з банкірскай здабычай. Некаторыя з гэтых фірм з цягам часу ператварыліся ў банкірскія канторы, якія займаліся выключна фінансава-крэдытнымі аперацыямі. Сам факт шырокага распаўсюджвання дадзенай катэгорыі банкаўскіх устаноў звязаны з нацыянальным фактарам: з 1791 г. беларускія губерні ўвайшлі ў «мяжу аседласці». Паводле новага закона ад 26 чэрвеня 1889 г. асноўны капітал канторы, якая адкрываецца ў вялікім горадзе, павінен быў быць не ніжэй чым 100 тыс. руб. [1]. Банкірскім канторам дазвалялася выдача пазык пад заклад працэнтных папер, акцый і аблігацый розных таварystваў; перавод грошай; прыём укладаў на тэр-

Рэпазіторый БДПУ